# МАЛІНКОВІЧ НІНА ПЯТРОЎНА.
# 90 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Нарадзілася Ніна Пятроўна Малінковіч (Левашова) у 1923 г. у в. Гарадзішчы Уладзімірскай вобласці. У 1941 г. скончыла сярэднюю школу ў г. Яраслаўлі і стала працаваць на шынным заводзе, які хутка быў эвакуіравана ў Омск. У 1942–1946 гг. яна вучылася на геафаку Маскоўскага педінстытута, які месціўся ў г. Малмыж Кіраўскай вобласці. У 1946 г. была пакінута для навучання ў аспірантуре па кафедры эканамічнай геаграфіі. Дысертацыю па тэме «Эканоміка-геаграфічная характарыстыка Кастрамской вобласці» яна абаранила ў 1954 г. Н.П. Малінковіч працавала на шэрагу геаграфічных факультэтаў СССР: Хабараўск (1949–1951), Галіч (1952–1954), Навазыбкаў (1955–1963), Магілёў (1963–1971). Усе пераезды былі звязаны з зачыненнем спецыяльнасці «Геаграфія» у тагачасных вну.

У Магілёўскім педінстытуце яна чытала курс «Эканамічная геаграфія СССР». У 1969 г. ёй было прысвоена званне дацэнта, у 1964–1971 гг. загадвала кафедрай эканамічнай геаграфіі. Актыўны член Геаграфічнага таварыства, лектар таварыства «Веды». Менавіта яна ўвяла ў шырокую практыку запрашэнні да чытання спецкурсаў буйных навукоўцаў з розных вну СССР (І. Маергойз, Б. Радаман, П. Сцяпанаў, С. Мельнічук, І. Трухан і інш.).

Сваім абаяннем, усмешкай, павbooважлівасцю, гатоўнасцю «увайсці ў становішча» іншага чалавека, прыйсці яму на дапамогу, Ніна Пятроўна прыцягвала да сабе і студэнтаў і выкладчыкаў. Яе кандыдатура ў 1971 г. была прапанавана на пасаду прарэктара па вучэбна-выхаваўчай працы МДПІ, але жыццёвыя калізіі вымусілі яе да змены жыхарства.

У 1971–1975 гг. Ніна Пятроўна працавала на геаграфічным факультэце Усць-Каменагорскага педінстытута (Казахстан). У 1975 г. Н.П. Малінковіч прайшла па конкурсе ў Кіраўскі педінстытут, прыступіла да працы, але ў канцы года яе не стала. Пахавана ў г. Кіраве.

*У.Г. Хамякоў*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова